**Яканюк Н.П.**, *дацэнт*

# НАРОДНА-ІНСТРУМЕНТАЛЬНАЯ МУЗЫЧНАЯ КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ: ДА ПЫТАННЯ ФАРМІРАВАННЯ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ІНСТРУМЕНТАРЫЯ

Музычны інструмент як з'ява матэрыяльнай культуры і як сродак стварэння музыкі. Народны музычны інструмент як прадмет даследавання этнаінструментазнаўства. Удасканаленне паняцця «народны музычны інструмент» з пункту гледжання сённяшняй навукі. Матэрыялы вывучэння народнага музычнага інструментарыя: пісьмовыя даныя, ускосныя літаратурныя сведчанні, хронікі, летапісы, малюнкі, элементы архітэктурнага дэкору, прадметы археалагічных раскопак, старадаўнія музычныя інструменты з калекцый музеяў, непасрэдныя назіранні, матэрыялы фальклорных экспедыцый, фота- і відэазапісы.

Крытэрый паходжання народных музычных інструментаў. Спрадвечныя (тутэйшыя) і прыўнесеныя (запазычаныя з іншых культур) народныя музычныя інструменты. Агульны агляд музычнага інструментарыя беларусаў у аспекце паходжання інструментаў. Перавага запазычаных музычных інструментаў у музычным інструментарыі беларускага народа. Практычныя і мастацкія функцыі тутэйшых і запазычаных музычных інструментаў беларусаў.

Асноўныя гістарычныя этапы фарміравання нацыянальнага музычнага інструментарыя:

1 перыяд - раннетрадыцыйны, ад рубяжа VI-VII стст. да фарміравання Вялікага княства Літоўскага. Выкарыстоўванне працейшых па канструкцыі музычных інструментаў - дудак з дрэва і птушынай косці, жалеек розных відаў, гліняных свісцёлак, нескладаных амбушурных (трубы, рагі), ударных інструментаў, якія адпавядалі пераважна практычным, працоўным, а часам і эстэтычным патрабаванням.

2 перыяд - XIII - канец XVIII ст. - эпоха Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Першы пераломны перыяд у



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

развіцці музычнага інструментарыя беларускага народа. Моцны ўплыў музычнай свецкай і каталіцкай культавай культуры на фарміраванне нацыянальнага інструментарыя. Этап запазычання і прыстасавання да ўласных патрэб распаўсюджаных музычных інструментаў Еўрапейскага сярэднявечча: цымбалаў, ліры, дуды (валынкі). Далейшае пашырэнне інструментарыя за кошт прафесійных музычных інструментаў, характэрных для музычнай культуры беларускіх магнатаў: кларнета, басэтлі (віяланчэлі ці кантрабаса), «турэцкага» барабана, мандаліны.

3 перыяд - XIX - першая палова XX ст. - другі «вялікі пералом». Прыўнясенне музычных інструментаў з музычнай культуры рускага народа (балалайка, гармонік). Знікненне ў сувязі з гэтым традыцыйных беларускіх народных музычных інструментаў дуды і ліры.

Вынікі. Сувязь музычнага інструментарыя з гісторыяй, звычаямі, побытам народа. Своеасаблівасці гісторыка-культурнага развіцця беларускіх земель як фактар, які абумоўлівае спецыфіку фарміравання беларускага музычнага інструментарыя. Змена сацыяльна-эканамічных фармацый, жыццёвага ўкладу, практычных, духоўных і мастацкіх патрэбнасцей як асноватворны фактары ўзбагачэння і пашырэння музычнага інструментарыя. Фарміраванне беларускага народнага музычнага інструментарыя як вынік своеасаблівага пранікнення, сінтэзу агульнаславянскай, заходнееўрапейскай і рускай музычных культур.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ